# Рост зарплат і ўдасканаленне пенсійнай сістэмы — Петрышэнка абазначыў прыярытэты для сацсферы

Фота з архіва

У Беларусі ў 2020 годзе забяспечаны прырост узроўню даходаў насельніцтва — галоўнага індыкатара дабрабыту грамадзян. Аб гэтым заявіў намеснік прэм’ер-міністра Ігар Петрышэнка, выступаючы на пасяджэнні калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе ўрада.

“У мінулым годзе ўстойліва павышалася заработная плата. Яе рэальны тэмп росту ў эканоміцы ў цэлым склаў 108,2 працэнта, па бюджэтнай сферы — больш за 113 працэнтаў. Выкананы галоўны мэтавы арыенцір — суадносіны зарплаты бюджэтнікаў і сярэдняй па краіне перавысілі 80 працэнтаў. Практычна поўнасцю вырашылі задачу па зніжэнні колькасці арганізацый з зарплатай меншай за Br500”, — падкрэсліў віцэ-прэм’ер. У той жа час статыстыка за студзень гэтага года сведчыць, што яшчэ даволі значная колькасць арганізацый знаходзяцца ў памежным стане і не маюць устойлівага перавышэння над зададзеным параметрам. Пастаўленую задачу па такіх арганізацыях неабходна выканаць да канца першага квартала.

Паводле слоў Ігара Петрышэнкі, на бягучы год задача больш амбіцыйная — падцягнуць зарплату ў арганізацыях, у якіх яна не перавышае сярэднюю па галіне. Віцэ-прэм’ер падкрэсліў, што кожная з іх павінна знаходзіцца ў пастаянным полі зроку міністэрства, неабходны аналіз дастатковасці і рэзультатыўнасці мер, якія прымаюцца на месцах. “Што датычыцца бюджэтнай сферы, то тут патрэбна дакладная стратэгія, як будзем рухацца далей. Мэтавыя задачы вызначаны, у тым ліку па

асобных катэгорыях работнікаў — педагогах, урачах і іншых. Цалкам відавочна, што тут давядзецца задзейнічаць усе магчымыя крыніцы і рэзервы — ад развіцця пазабюджэтнай дзейнасці да аптымізацыі сеткі і пераходу на нарматыўна-мэтавы прынцып бюджэтавання галін. Пры гэтым Міністэрству працы і сацыяльнай абароны неабходна больш прадметна займацца пытаннямі заработнай платы ва ўласнай галіне. Гэта ваш кадравы патэнцыял", — звярнуў увагу Ігар Петрышэнка.

Ён таксама падкрэсліў, што апошнім часам пытанні занятасці насельніцтва набылі асаблівую значнасць з улікам бягучай сітуацыі на рынку працы. Месяц таму пытанні занятасці праз прызму дэкрэта нумар 3 былі тэмай прадметнага разгляду на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. "Створаны дэкрэтам механізм з'яўляецца важным інструментам сацыяльнай палітыкі і павінен быць у поўнай меры выкарыстаны для вырашэння пастаўленых задач. Неабходна далейшае развіццё механізмаў стымулявання занятасці асобных катэгорый насельніцтва", — адзначыў віцэ-прэм'ер.

Ключавым напрамкам работы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў бягучай пяцігодцы застаецца выпрацоўка эфектыўных мер дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, забеспячэнне стабільнасці дэмаграфічнага развіцця. "Так, вельмі шмат зроблена за папярэднія гады. Разам з тым вастрыня дэмаграфічных праблем патрабуе прыняцця далейшых рэзультатыўных крокаў. На Усебеларускім народным сходзе Прэзідэнт даручыў распрацаваць праграму "Шматдзетная Беларусь", напоўніць яе дзейснымі мерамі, здольнымі даць дадатковы дэмаграфічны эфект", — канстатаваў Ігар Петрышэнка.

Важнейшым інструментам падтрымкі грамадзян, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, аб'ектыўна маючых нізкі ўзровень даходаў, з'яўляецца сістэма дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі. "Толькі за 2020 год яе атрымальнікамі сталі звыш 305 тыс. чалавек, што на 3,5 працэнта больш у параўнанні з 2019 годам. Сума прадстаўленай дапамогі павялічылася на 19 працэнтаў і склала Br112,4 млн. Тут таксама ёсць нямала

рэзерваў для павышэння эфектыўнасці, спрашчэння адміністрацыйных працэдур", — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Акрамя таго, Ігар Петрышэнка звярнуў увагу, што на парадку дня застаюцца пытанні далейшага ўдасканалення пенсійнай сістэмы. "Кожны чацвёрты жыхар нашай краіны сёння з'яўляецца атрымальнікам пенсійных выплат. Расходы Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на названыя мэты перасягнулі ў 2020 годзе Br13,3 млрд. Гэта больш за 9 працэнтаў ВУП. У няпростых эканамічных умовах не дапушчана зніжэння пакупной здольнасці пенсій. Іх рост у рэальным выражэнні забяспечаны на ўзроўні 4 працэнтаў", — адзначыў ён.

Віцэ-прэм'ер закрануў і блок пытанняў, якія датычацца сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. "Актуальнасць і значнасць гэтых пытанняў для эканомікі і грамадства будуць толькі нарастаць. Да 2030 года кожны пяты жыхар нашай краіны перасягне 65-гадовы рубеж. Таму ўжо сёння мы павінны бачыць абсалютна выразныя перспектывы вырашэння не толькі бягучых праблем, але і задач сярэдне- і доўгатэрміновага характару. Патрабуе глыбокага змястоўнага напаўнення работа па рэалізацыі зацверджанай урадам нацыянальнай стратэгіі "Актыўнае даўгалецце — 2030″. Гэта тэма павінна праходзіць чырвонай ніткай праз усе праводзімыя ў краіне мерапрыемствы як на рэспубліканскім, так і на мясцовым узроўні", — заявіў ён.

Таксама Ігар Петрышэнка выказаў меркаванне, што сферай асаблівай увагі міністэрства і мясцовых органаў улады павінна заставацца сацыяльная падтрымка асоб з інваліднасцю, іх комплекснай рэабілітацыі і інтэграцыі ў грамадства. "Вектар у гэтай рабоце павінен зрушвацца ад поўнага дзяржаўнага патэрналізму ў бок стварэння належных умоў для нармальнай жыццядзейнасці названай катэгорыі грамадзян. Неабходна актыўна вывучаць і ўкараняць існуючы перадавы вопыт, прымаць меры па пашырэнні магчымасцей для забеспячэння максімальнай занятасці людзей з інваліднасцю, што адпавядае іх інтарэсам і патрэбам грамадства, прадугледзець укараненне новых форм работы і

падтрымкі канструктыўных ініцыятыў”, — рэзюмаваў намеснік прэм’ер-міністра.

БЕЛТА

---

# Саўмін зацвердзіў дзяржпраграму “Увекавечванне памяці аб загінулых пры абароне Айчыны” да 2025 года

Фота з архіва

Савет Міністраў зацвердзіў дзяржаўную праграму “Увекавечванне памяці аб загінулых пры абароне Айчыны” на 2021-2025 гады. Гэта прадугледжана пастановай урада ад 26 лютага 2021 года нумар 117, паведамляе БЕЛТА са спасылкай на Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал.

Праграма распрацавана ў мэтах захавання памяці аб загінулых пры абароне Айчыны і ахвярах войнаў. “Рэалізацыя дзяржпраграмы будзе садзейнічаць захаванню ваенна-гістарычнай спадчыны беларускага народа, грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню, выкананню міжнародных пагадненняў у ваенна-мемарыяльнай сферы”, — гаворыцца ў дакуменце.

Распрацаваны комплекс мерапрыемстваў. У іх ліку добраўпарадкаванне, утрыманне, бягучы і капітальны рамонт мемарыяльных комплексаў, мясцін баявой славы, воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр войнаў, пошукавая работа для ўсталявання даных аб загінулых вязнях лагера і іх захаванне ў электроннай “Кнізе Памяці ахвяр лагера смерці “Трасцянец”,

палявыя пошукавыя работы. Таксама ў планах суправаджэнне аўтаматызаванага банка даных “Кніга Памяці Рэспублікі Беларусь” з выкарыстаннем інтэрнэту.

На фінансаванне праграмы неабходна больш за Br9,2 млн.

Пастанова ўступае ў сілу пасля афіцыйнага апублікавання і распаўсюджвае сваё дзеянне на адносіны, што ўзніклі з 1 студзеня 2021 года.

БЕЛТА

---

# Дзень посткросера пройдзе 1 сакавіка ва ўсіх аддзяленнях “Белпошты”

Фота з архіва

Акцыя “Дзень посткросера” пройдзе 1 сакавіка ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі Беларусі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе РУП “Белпошта”.

У гэты дзень пры адпраўцы 10 і больш міжнародных паштовых картак прадастаўляецца скідка 10 працэнтаў.

Посткросінг – гэта міжнародны анлайн-праект, дзе незнаёмыя людзі з розных куткоў планеты абменьваюцца паштовымі карткамі і маркамі. “Сюрпрыз у вашай паштовай скрынцы” – асноўны дэвіз посткросінгу.

Каб далучыцца да праекта, неабходна зарэгістравацца на сайце www.postcrossing.com, пазначыўшы свой дамашні адрас і кароткую інфармацыю пра сябе (захапленні, пажаданні, якія паштоўкі

падабаюцца, што хочацца даведацца аб іншай краіне), і адправіць паштоўкі пяці жыхарам розных краін, адрасы якіх прапануе сістэма сайта. Праз некаторы час у адказ прыйдуць паштоўкі з усяго свету.

БЕЛТА

---

# Туман і галалёдзіца чакаюцца ў Беларусі 2 сакавіка

1 сакавіка, Мінск /Кар. БЕЛТА/. Туман і галалёдзіца чакаюцца ў Беларусі 2 сакавіка, паведамілі БЕЛТА ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У аўторак будзе воблачна з праясненнямі, пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па паўночным усходзе краіны месцамі пройдуць кароткачасовыя мокры снег і дождж. У начны і ранішні час у асобных раёнах магчымы туман. На асобных участках дарог будзе галалёдзіца. Вецер заходні 4-9 м/с, удзень парывы да 14 м/с.

Тэмпература паветра ў начны час будзе вагацца ад мінус 2 да плюс 3 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да плюс 3-9 градусаў.

БЕЛТА

---

# Лукашэнка: трэба сур'ёзна выбудаваць, а дзе-нідзе і перабудаваць работу Савета бяспекі

Фота з архіва
Трэба сур'ёзна выбудаваць, а дзе-нідзе і перабудаваць работу Савета бяспекі Беларусі. Аб гэтым Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заявіў сёння на сустрэчы з дзяржаўным сакратаром Савета бяспекі Аляксандрам Вальфовічам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Паводле слоў Прэзідэнта, абапірацца ў гэтай рабоце трэба ў тым ліку на вопыт работы аналагічных структур у блізкіх краінах. Напрыклад, Расіі і Казахстане.

БЕЛТА

---

# Туман і галалёдзіца чакаюцца ў Беларусі 25 лютага

Фота з архіва
Туман і галалёдзіца на асобных участках дарог чакаюцца ў Беларусі 25 лютага, паведамілі БЕЛТА ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У чацвер будзе воблачна з праясненнямі. Уначы прагназуецца без

істотных ападкаў, раніцай і ўдзень у асобных раёнах пройдзе невялікі дождж. У начны і ранішні час месцамі магчымы туман, слабы галалёд. Вецер заходні 4-9 м/с, удзень па поўначы парывы да 12 м/с.

Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. Удзень чакаецца 3-9 градусаў цяпла, у паўднёва-заходніх раёнах – плюс 10-13 градусаў.

БЕЛТА

---

# Здаровая нацыя, кадры і міжрэгіянальныя цэнтры – Петрышэнка абазначыў прыярытэты для аховы здароўя

Намеснік прэм’ер-міністра Ігар Петрышэнка сёння на падагульняючай калегіі Міністэрства аховы здароўя абазначыў прыярытэты для галіны, перадае карэспандэнт БЕЛТА.
Віцэ-прэм’ер адзначыў, што максімальна выразныя задачы для сістэмы аховы здароўя пастаўлены кіраўніком дзяржавы на VI Усебеларускім народным сходзе. У прыватнасці, трэба рэалізаваць маштабны праект “Здаровая нацыя”, у аснове якога чатыры асноўныя стаўпы: мабільная медыцына, крокавая даступнасць, клапатлівая паліклініка, высокатэхналагічная медыцына ў рэгіёнах. “У гэтай рабоце ёсць добры зачын, але ўсе вы павінны дакладна разумець усю напружанасць пастаўленых перад галіной задач, адказнасць кожнага канкрэтнага выканаўцы”, – сказаў Ігар Петрышэнка.

Міністэрствам не пазней за I паўгоддзе бягучага года павінны быць распрацаваны і зацверджаны максімальна канкрэтныя планы-заданні, тэрміны іх рэалізацыі і індыкатары, даведзеныя да кожнага раёна. Намеснік прэм’ер-міністра падкрэсліў, што кожны галоўны ўрач ЦРБ і старшыня райвыканкама павінны разумець, што яны абавязаны забяспечыць і за што будуць адказваць: пачынаючы ад ўкамплектаванасці і замацавання кадраў, заканчваючы машынамі хуткай дапамогі, медыцынскім абсталяваннем і лічбавізацыяй.

У бліжэйшы час павінна быць атрымана адчувальная аддача ад развіцця міжрэгіянальных і міжраённых цэнтраў спецыялізаванай медыцынскай дапамогі, адзначыў Ігар Петрышэнка. Паводле яго слоў, цэнтры для рэгіёнаў павінны стаць апорнымі, забяспечваць рэальную даступнасць для насельніцтва асноўных відаў такой дапамогі. З іх развіццём трэба ўвязваць і планы перааснашчэння арганізацый аховы здароўя.

Неабходна паскорыць распрацоўку інфармацыйнай платформы, якая дае магчымасць у аўтаматычным рэжыме кантраляваць самастойныя (дэцэнтралізаваныя) закупкі арганізацыямі аховы здароўя медыцынскай тэхнікі і вырабаў медыцынскага прызначэння. З гэтым непасрэдна звязаны пытанні эфектыўнасці расходавання бюджэтных сродкаў. “Ніякіх пасрэднікаў і “прыкормленых”, як сказаў кіраўнік дзяржавы, тут быць не павінна. Ніякага перавышэння цэн пры пастаўках у межах краіны аднатыпных тавараў”, — звярнуў увагу віцэ-прэм’ер.

Далейшага ўдасканалення патрабуе работа міністэрства і абласных упраўленняў па кантролі за функцыянаваннем і своечасовым рамонтам высокатэхналагічнага абсталявання. “Пакуль належнага выніку тут таксама не дасягнута”, — заўважыў ён.

Намеснік прэм’ер-міністра звярнуў увагу на важнасць падрыхтоўкі і ўкамплектаванасці кадрамі. “Думаю, што наспела пытанне аб змяненні падыходаў да нарміравання штатнай колькасці медыцынскіх работнікаў, увязцы колькасці персаналу з

аб'ёмам выкананых работ і, безумоўна, з адпаведным узроўнем аплаты працы", — сказаў ён. Міністэрству аховы здароўя трэба глыбока прапрацаваць гэту тэму і выпрацаваць канкрэтныя прапановы. Аснову гэтаму павінен у тым ліку закласці рэалізуемы міністэрствам пілотны праект па пераводзе фінансавання галіны на прынцыпы клініка-затратных груп.

Акрамя таго, Ігар Петрышэнка звярнуў увагу на важнасць пастаяннай адкрытай зваротнай сувязі з насельніцтвам, спажыўцамі медыцынскіх паслуг. Ён лічыць, што мэтазгодна правесці мэтавыя рэгіянальныя сацыялагічныя апытанні і даследаванні, размясціць адпаведныя апытальнікі і анкеты на сайце Міністэрства аховы здароўя. І ў цэлым неабходна перагледзець структуру і напаўненне сайтаў (ад міністэрства да кожнай ЦРБ), адпаведных раздзелаў у сацсетках, зрабіўшы іх на больш высокім прафесійным узроўні, у першую чаргу інфарматыўнымі і зручнымі для карыстальнікаў.

БЕЛТА

---

# Паэтэса Валянціна Чвалава праз прызму вершаваных радкоў — аб жыццёвай пазіцыі, сіле літаратурнага слова і аб падтрымцы Прэзідэнта

**Прызнавацца ў любові да Беларусі, да прыроды малой радзімы, апяваць у вершах дзіўны свет беларускага мастацтва не раз даводзілася паэтэсе Валянціне Чвалавай. А вось падзякаваць**

**Прэзідэнту за мір і спакой у краіне, за правільна абраны дзяржаўны курс з дапамогай вершаванага слова літаратару да жніўеньскіх падзей не даводзілася не разу. Аднак, на думку Валянціны Чвалавай, словы паэта заўсёды гучаць ярчэй, калі яны накіраваны на яднанне грамадства. Аб жыццёвай пазіцыі, сіле літаратурнага слова і аб падтрымцы Прэзідэнта праз прызму вершаваных радкоў пагаварылі з паэтэсай.**

У яе скарбонцы — персанальны зборнік вершаў «Заберазь», у якім паэтэса зарыфмавала настальгію па малой радзіме. Друкаваліся яе літаратурныя творы таксама ў часопісах, вершаваных зборніках.

Валянціна Чвалава (у дзявоцтве Салановіч) нарадзілася ў вёсцы Заберазь Гродзенскай вобласці Іў'еўскага раёна ў сям'і вясковых педагогаў. Яшчэ ў пачатковай школе яна зразумела, што ў ёй жыве дух мастака літаратурнага слова. Дзяўчынка цікавілася літаратурай, выяўленчым мастацтвам. Калі надышоў час паступлення, яна абрала педінстытут імя М. Горкага. Пасля была праца ў якасці кіраўніка дома культуры ў Бярозках, музычнага работніка дзіцячага садка. Работу сваю наша гераіня вельмі любіла, аддавала ёй усю сябе. Калі працаваць, то толькі на вынік! Прызнаецца, што сіндром выдатніцы не дазваляў ёй рабіць нешта абыякава. Адначасова з асноўнай працай яна пакрысе пісала вершы.




— *Усё сваё жыццё я актыўна займалася творчасцю,* — узгадвае Валянціна Чвалава. — *У 2000 годзе стала членам літаратурнага аб'яднання «Пралеска». Такое прызнанне дало новы імпульс творчасці.*

У 2007 годзе пабачыў свет яе лірычны зборнік «Заберазь». Калегам-літаратарам вельмі спадабалася дэбютная кніга пісьменніцы. Прыгажосць родных краявідаў, чалавечыя стасункі — Валянціна Чвалава закранае разнастайныя тэмы. Кожны твор выклікае шмат эмоцый і прымушае падумаць над нечым вельмі важным. У мітусні дзён трэба не заблытацца ў жыцці. Мяркую, кнігі паэтэсы могуць даць адказы на хвалюючыя сэрца пытанні.







Мяне, як чалавека, далёкага ад літаратурнай творчасці, заўсёды цікавіў алгарытм напісання вершаў. Паэтэса расказала пра гэты

складаны, але вельмі займальны працэс:

*— Вершы пішуцца не заўсёды, а тады, калі ў гэтым узнікае ўнутраная патрэбнасць. Калі проста немагчыма не выразіць думкі ў творы. Да жнівеньскіх падзей я ў прынцыпе была чалавекам апалітычным. Аднак, калі ўбачыла, што з-за бяздумных дзеянняў некаторых людзей наша краіна можа раптоўна страціць усё, што было створана народам за гады незалежнасці, вырашыла, што не магу маўчаць. Праз літаратурнае слова я хацела падтрымаць Прэзідэнта і той абраны курс развіцця нашай дзяржавы, па якім ідзе краіна вось ужо не адно дзесяцігоддзе. Заўсёды бачыла, што наш Прэзідэнт — моцны кіраўнік, які сапраўды стараецца для Беларусі,* — падкрэсліла Валянціна Чвалава. — *Погляды кіраўніка дзяржавы на жыццё, сістэма каштоўнасцей, светапогляд добра былі адлюстраваны ў яго дакладзе на першым Усебеларускім народным сходзе. Так давайце аб'яднаемся ў імкненні спакойна жыць і развівацца! А творчасць і літаратурная думка стануць падтрымкай і даведнікам да будучых гарызонтаў.*

Пачуцці і думкі Валянціны Чвалавай сёння гучаць праз вершаваныя радкі, якія могуць сказаць аб жыццёвай пазіцыі сапраўднага патрыёта сваёй Айчыны:

*— Мы дзякуй "скажым" шчыра Прэзидэнту,*

*Падтрымку шлём, сардэчных добрых слоў,*

*Каб жылі на Беларусі вечна,*

*Расцілі сваіх дочак и сыноў.*

*http://sozhnews.by*

# Лукашэнка: рашэнні УНС не будуць спантаннымі і нечаканымі

Рашэнні УНС не будуць спантаннымі і нечаканымі, паколькі да пачатку форуму была праведзена вялікая плённая праца, у тым ліку ў фармаце дыялогавых пляцовак. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў сёння, выступаючы на адкрыцці VI Усебеларускага народнага сходу, перадае карэспандэнт БЕЛТА.
Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўжо шосты раз у суверэннай гісторыі краіны звяртаюцца непасрэдна да народа, каб разам абмеркаваць і прыняць кансалідаванае рашэнне па далейшым развіцці нашай краіны і грамадства.

БЕЛТА

---

# Прэзентацыя сумеснага праекта “Цікавая геаграфія”: журналісты “Маяка” і “Добрушскага краю” распавядаюць пра аднолькавыя

# найменні двух паселішчаў, якія аддзяляе 70 кіламетраў

У Гомельскай вобласці, ды што там – нават у адным раёне можна знайсці некалькі населеных пунктаў з аднолькавай назвай. Але ж цікава было б даведацца, што стала асновай для аднаго наймення двух паселішчаў, якія аддзяляе каля 70 кіламетраў. Журналісты дзвюх рэдакцый – "Маяка" і "Добрушскага краю" – паспрабавалі адкрыць гэты сакрэт.

**Падарожжа першае**

**Пасёлак Добруш Руднемарымонаўскага сельсавета Гомельскага раёна: двайное перасяленне**

Калісьці пасёлак Добруш, які быў заснаваны ў 1926–1927 гадах, быў даволі шматлюдны – тут пражывала больш за сто чалавек, аднак зараз – толькі тры. Канечне, на лецішчы прыязджаюць нашчадкі, апрацоўваюць гароды, бо большасць іх пражывае непадалёк ад Добруша – у суседняй вёсцы Рудня Марымонава.


ДОБРУШ
sozhnews.by


sozhnews.by




Вольга Казлова – дачка адной з першапасяленцаў Таісіі Марымонавай. Зараз бібліятэкар Руднемарымонаўскай базавай школы захоўвае памяць пра продкаў і гісторыю двух родных для яе паселішчаў – Добруша і Рудні Марымонвай.

*– У пачатку ХХ стагоддзя некалькі сем’яў з Рудні Марымонавай вырашылі паспытаць шчасця на новым месцы. Ім стаў цяперашні пасёлак Добруш,* – расказала Вольга Мікалаеўна. *– Для гэтага былі дзве прычыны: раней вёску пастаянна затаплівала. Таму і дамы размяшчаюцца нераўнамерна: тут няма доўгай прамой вуліцы, бо людзі сяліліся на больш высокіх мясцінах, на пагорках, так сказаць на-водшыбе ад суседзяў.*




А вось будучае паселішча выгадна адрознівалася: вада вясной і ўвосень дасюль не даходзіла. Не тое, што ў Рудні: у сярэдзіне 1950-х гадоў тут была такая паводка, што знесла нават мосцік праз невялікую рачулку.

*— Добрае месца выбралі нашы продкі! Таму і назвалі пасёлак Добрушам,* — пацвердзіла ягоная жыхарка Ганна Лагута. — *Канешне, спачатку давялося раскарчаваць дрэвы, каб пабудаваць дамы і разбіць гароды.*

Але ж людзі былі згодныя і на гэта, бо кожная сям'я (а тады ўсе яны былі шматдзетнымі) набывала даволі вялікія надзелы зямлі. Пакрысе на пагорку з'явілася больш за сто хат, пражывала амаль дзвесце чалавек.

*— Многія жыхары Добруша былі родзічамі, бо першапася-ленцамі сталі некалькі сем'яў,* — паведаміла Вольга Казлова. — *Жылі тут Маёравы, Саўковы, Пяшыны, Петрусенкі, Захаравы, Бярнацкія, але ж часцей за ўсё іх называлі па вясковых мянушках, напрыклад, Цузорыкамі. Адкуль пайшло гэтае найменне, зараз ужо ніхто і не*

*памятае...*


Маёраў К.Я.
Маёраў М.С.
sozhnews.by


КНИГА
учета трудодней колхозников
sozhnews.by

У 30-я гады мінулага стагоддзя на былых памешчыцкіх землях, дзе і ўзнік пасёлак Добруш, быў арганізаваны калгас “Смелы”, які ўзначаліў Кляменцій Новікаў. Займалася калектыўная гаспадарка раслінаводствам і жывёлагадоўляй.

Дагэтуль у школьным музеі захава-ліся некалькі гаспадарчых кніг, якія адлюстроўваюць тагачасны ўклад жыцця і працу жыхароў Добруша. Напрыклад, журнал уліку працадзён брыгад № 1 і 4 за 1947 і 1949 гады, дзе сустракаюцца прозвішчы Шак, Сатыраў, Петрусенка… Дарэчы, на старонцы з прозвішчам Лапыроў ёсць і такія запісы: “Лапырова Анісся” і “Лапыроў Міша”: дзеці дапамагалі бацьку падчас жніва, і адпрацавалі цэлы месяц. На іх таксама была разлічана аплата за працадні.

З цягам часу пачаўся адваротны працэс: моладзь усё больш імкнулася пераехаць на пастаяннае месца жыхарства ў Рудню Марымонаву: грунтовыя воды сышлі ў глыбіню, таму цяпер пра паводкі ўжо нічога не чуваць. А вось тое, што вёска стала цэнтрам сельсавета, адыграла вялікую ролю. Тут з’явілася ўся неабходная інфраструктура – адкрыліся школа, магазіны, амбулаторыя, установа культуры, ды і да працы людзям было лепей дабірацца.

Вось так і атрымалася: сто гадоў таму з Рудні людзі пераязджалі ў Добруш, а зараз – наадварот.

*– Пасёлак будзе існаваць да таго часу, пакуль тут ёсць жыхары,* – упэўнены старшыня руднемарымонаўскага сельвыканкама Сямён Чэчыкаў. – *Канешне, дамы ў Добрушы, што засталіся ад бацькоў і дзядоў, нашчадкі часцей выкарыстоўваюць як лецішчы. Аднак, спадзяюся, што некаторыя змогуць ацаніць цішыню і прыгажосць гэтых мясцін і застануцца тут на пастаяннае пражыванне.*

**Падарожжа другое**

**Раённы цэнтр Добруш Гомельскай вобласці**

Старажытнае паданне сведчыць: калісьці беглыя сяляне,

ратуючыся ад прыгону, шукалі месца для пасялення. І прыйшлі яны на высокі бераг, дзе раслі дубровы ды сасоннікі, а праз іх празрыстай стужкай вілася рака.

— *Дабро ж,* — сказаў адзін з сялян.

— *І пуць далёкі,* — пацвердзіў другі, паказваючы на бясконцыя прасторы.

Засталіся выгнаннікі ў гэтым прыгожым кутку на беразе ракі. Пасяленне сталі зваць Добрушам, а раку побач — Іпуццю.

Калі ж звярнуцца да гістарычных дакументаў, то ў “Рэестры рэвізіі гаспадарскай Гомельскай воласці 1560 года” Добруш упершыню ўпамінаецца як пасяленне Гомельскага староства. Дзякуючы геаграфічнаму размяшчэнню, Добруш стаў кустарна-прамысловым цэнтрам па вытворчасці канатаў і ветразяў. Гэтая “спецыялізацыя” знайшла адлюстраванне і ў старажытным гербе: тры бухты канатаў на зялёным фоне.

Да 1834 года паселішча належала графу Румянцаву, які пабудаваў у мястэчку лесапільны завод і млыны. Некаторы час тут таксама існавалі ткацкая мануфактура і шклозавод. У 1870 годзе князь Паскевіч, сумесна з купцамі Лаўянавым і Саламонавым заснаваў у Добрушы папяровую фабрыку. З цягам часу яна стала займаць адно з вядучых месцаў сярод такіх жа прадпрыемстваў. Прадукцыя Добрушскай папяровай фабрыкі карысталася асаблівым попытам: выраблялася нават царская папера, а таксама для друкавання грошаў. Дарэчы, менавіта ў Добрушы ў 1899 годзе на рацэ Іпуць была пабудавана першая на тэрыторыі сучаснай Беларусі гідраэлектрастанцыя.




Пасля рэвалюцыі прадпрыемства нацыяналізавалі, а ў 1920 годзе рашэннем губернскага Савета дэпутатаў папяровай фабрыцы прысвоілі ганаровае званне “Герой працы”. Яе развіццё паўплывала і на рабочы пасёлак, які пашыраўся за кошт будаўніцтва жылля для рабочых. Былі ўзведзены таксама клуб, паліклініка, школы. Добруш набыў ўсесаюзную вядомасць як горад, дзе выраб-ляецца якасная папера і розныя рэчы з яе.

Аднак Добруш не мінула і фашысцкая навала. Раённы цэнтр перажыў некалькі гадоў акупацыі і актыўнае супраціўленне ворагу – на тэрыторыі раёна дзейнічалі партызанскія атрады, а ў самім горадзе – падполле, сотні дабрушан ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў некалькі вуліц былі названы імёнамі дабрушан – Герояў Савецкага Саюза.

Зараз Добруш, які яшчэ называюць “маленькай Венецыяй”, – даволі буйны горад. Тут дзейнічаюць папяровая фабрыка, фарфоравы завод – адзіны вытворца фарфоравага посуду на тэрыторыі Беларусі, вырабы якога карыстаюцца попытам далёка за

межамі краіны, іншыя прамысловыя аб’екты. Развіваецца сфера аказання паслуг – дзейнічаюць установы адукацыі, аховы здароўя, некалькі цэнтраў культуры, краязнаўчы музей, адкрываюцца новыя магазіны рознай формы ўласнасці. Добруш мае добрыя перспектывы для развіцця і захавання чалавечага патэнцыялу – асноўнага багацця “беларускай Венецыі”.




http://sozhnews.by

---

# Беларусь і Расія аднаўляюць чыгуначныя зносіны

Фота з архіва
8 лютага, Мінск /Кар. БЕЛТА/. Расія і Беларусь з сённяшняга

дня аднаўляюць чыгуначныя зносіны, перадае ТАСС.

Поезд нумар 1/2 Масква – Мінск фарміравання Беларускай чыгункі ў панядзелак, 8 лютага, адправіцца ў першы рэйс з Мінска пасля працяглага перапынку. З Масквы ён адправіцца ў зваротным напрамку ў аўторак, 9 лютага, далей будзе курсіраваць праз дзень.

Згодна з графікам, з Мінска поезд будзе выходзіць у 22.10 (супадае з маскоўскім) і прыбываць на Беларускі вакзал Масквы ў 8.13 наступнага дня. У зваротны рэйс з Масквы ён будзе адпраўляцца ў 22.13 і прыбываць у Мінск на наступны дзень у 7.26. Па шляху руху па тэрыторыі РФ поезд для пасадкі і высадкі пасажыраў будзе рабіць прыпынкі ў Смаленску і Вязьме.

Плануецца, што з 9 лютага ў Мінску прыпынак для пасадкі і высадкі пасажыраў будзе рабіць поезд нумар 30/29 "Янтар" Калінінград – Масква фарміравання Федэральнай пасажырскай кампаніі (даччынае таварыства РЧ) з магчымасцю праезду ў ім грамадзян РФ і Беларусі на ўчастку Масква – Мінск – Масква. Поезд курсіруе кожны дзень, цяпер па тэрыторыі рэспублікі ён ідзе транзітам.

Аб аднаўленні руху іншых міжнародных пасажырскіх паяздоў паміж Расіяй і Беларуссю будзе аб'яўлена дадаткова, паведамілі ў РЧ.

Калегія Еўразійскай эканамічнай камісіі раней прыняла метадычныя рэкамендацыі па прафілактыцы распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі ў паяздах далёкага накіравання. Асобы, якія прыбываюць у краіны ЕАЭС, павінны мець адмоўны тэст на COVID-19, выдадзены за тры дні да перасячэння граніцы, за выключэннем дзяцей да пяці гадоў. Калі ў пасажыра, які мае даведку аб адмоўным тэсце, на момант прыбыцця да граніцы будзе зафіксавана павышаная тэмпература, ён размяшчаецца на ізаляцыю ў інфекцыйны стацыянар.

Пры гэтым пасажыры, якія не будуць мець даведак аб адсутнасці COVID-19 пры ўездзе на тэрыторыю краіны, павінны быць ізаляваны ў каранцінным стацыянары на тэрмін да двух сутак для

правядзення тэсціравання. Пасля атрымання рэзультатаў асобы са станоўчым рэзультатам пераводзяцца ў інфекцыйны стацыянар для лячэння, асобы з адмоўным рэзультатам ізалююцца дома на працягу 12 сутак. У выпадку адсутнасці ўмоў для ізаляцыі дома рэкамендуецца ізаляцыя ў спецыяльна вызначаных для гэтага памяшканнях, вынікае з рэкамендацый.

БЕЛТА

---

# На малай радзіме народнага пісьменніка Беларусі, Хойнікшчыне, адкрыты дом-музей Івана Мележа

**У Пятрушынскай сельскай бібліятэцы Растоўскай вобласці, якой у 2017 годзе прысвоена імя Івана Мележа, сёння з'явіцца мемарыяльны літаратурны пакой народнага пісьменніка Беларусі.** Такое рашэнне прынята на заканадаўчым узроўні расійскага рэгіёна як вынік плённага творчага супрацоўніцтва пісьменнікаў Гомельскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» і іх расійскіх калег.

Беларускія і расійскія літаратары з Растоўскай вобласці пасябравалі даўно, актыўна працуюць разам у межах двух творчых праектаў – міжнароднага фестывалю-свята "Славянскія літаратурныя дажынкі" і міжнароднага фэсту-конкурсу паэзіі і паэтычных перакладаў "Берагі дружбы".




*— Сябра нашай краіны, расійскі паэт Леанід Север, агучыў ідэю увекавечвання аднаго з творцаў беларускай літаратуры на яго малой радзіме*, — адзначыў старшыня абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Гаўрыловіч. — *Мы прапанавалі ўшанаваць памяць Івана Мележа, ураджэнца Хойніцкага раёна, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны. Падчас баёў за Растоў-на-Доне ў 1942 годзе быў цяжка паранены і лячыўся ў растоўскім шпіталі.*







Прапанова гомельскіх літаратараў была накіравана кіраўніцтву расійскага рэгіёна і хутка рэалізавана: імя класіка беларускай

літаратуры Івана Мележа летам 2017-га атрымала муніцыпальная бюджэтная ўстанова культуры «Пятрушынская сельская бібліятэка Новабессяргенеўскага сельскага пасялення Неяклінаўскага раёна Растоўскай вобласці". Тады ж з удзелам кіраўніцтва Гомельскага аддзялення СПБ у Пятрушына была ўрачыста адкрыта мемарыяльная дошка, і пісьменнікі Гомельшчыны перадалі ў дар бібліятэцы творы Івана Мележа.

Час паказаў: да творчасці класіка беларускай літаратуры ў расійскай глыбінцы цікавасць з году ў год толькі павялічваецца. На базе бібліятэкі, якая носіць яго імя, штогод ладзяцца канферэнцыі, творчыя сустрэчы, у тым ліку з гомельскімі творцамі, якія ўдзельнічаюць у працы фестываля "Берагі дружбы".

Праз нейкі час па ініцыятыве супрацоўнікаў бібліятэчнай установы і пры падтрымцы мясцовых уладаў, нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Растоўскай вобласці» і нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Кубані» было прынята рашэнне аб далейшай папулярызацыі творчасці беларускага пісьменніка і адкрыцці да яго 100-годдзя на базе бібліятэчнай установы мемарыяльнага пакоя.


sozhnews.by


sozhnews.by


Ундервудъ
Іван Мележ
"УНДЕРВУДЪ"
Асабістая друкарская
машынка пісьменніка
sozhnews.by


sozhnews.by


І. Мележ, П. Панчанка
sozhnews.by


Іван Мележ сярод выбаршчыкаў
у Петрыкаве
sozhnews.by







Годная ініцыятыва зноў аб’яднала творцаў і работнікаў культуры дзвюх краін: для падрыхтоўкі экспазіцыі ў Растоўскую вобласць

накіравалі нямала электронных копій фотадакументаў, звязаных з жыццём і творчасцю пісьменніка.

Удзельнікамі ўрачыстага адкрыцця стануць няклінаўцы і гамяльчане: падчас міжнароднага тэлемаста беларусы і расіяне адкрыюць новую музейную экспазіцыю, а таксама абмяркуюць далейшае супрацоўніцтва на ніве культуры і літаратуры.

http://sozhnews.by